**РЭФЕРАТ**

Справаздача 232 с., 62 крын.

ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЯ ГЕРМЕНЕЎТЫКА, ГЕРМЕНЕЎТЫЧНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ, ФЕНАМЕНАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ, ПАЭТЫКА, ТЫПАЛОГІЯ ГЕРОЯ, ЖАНРАЎТВАРЭННЕ, АНТРАПАЛОГІЯ, РЭЦЫПІЕНТ, КАНЦЭПТАСФЕРА, АКСІЯЛАГІЧНЫЯ ДАМІНАНТЫ

Аб’ект даследавання – беларуская проза XX – пач. XXI стст.: жанравае станаўленне, дынаміка і сінтэтызм жанравых празаічных формаў; тыпалогія героя, наратыўныя стратэгіі, нацыянальная спецыфіка, аксіялагічная прастора, мастацкі хранатоп, паэтыка.

Прадмет даследавання – этапы станаўлення і функцыянаванне празаічных жанраў нацыянальнай літаратуры XX – пач. XXI стст., антрапалагічная тыпалогія мастацкіх персанажаў, спецыфіка сюжэтна-апавядальнай плыні, часапрасторы, паэтыкі і стылістыкі; аўтарская пазіцыя, аксіялагічныя дамінанты аўтара і героя, ідэйна-эстэтычны і маральна-філасофскі патэнцыял твораў нацыянальнай прозы (паводле герменеўтычных і фенаменалагічных падыходаў).

Мэта НДР – на аснове герменеўтычных і фенаменалагічных стратэгій літаратуразнаўства даследаваць дынаміку жанравай сістэмы, філасофска-антрапалагічную і гісторыка-эстэтычную абумоўленасць канцэпцыі і тыпалогіі літаратурнага героя, ідэйна-мастацкага свету аўтара і героя ў беларускай прозе XX – пачатку XXI стст.

Метады даследавання – герменеўтычная інтэрпрэтацыя, фенаменалагічныя падыходы, агульналагічныя метады пазнання (абагульненне, аналогія), культурна-гістарычны, гісторыка-функцыянальны, структурна-канцэптны.

Атрыманыя вынікі і іх навізна. Абгрунтавана мэтазгоднасць герменеўтычных, фенаменалагічных, аксіялагізаваных, гісторыка-функцыянальных метадалагічных стратэгій для сучаснага айчыннага літаратуразнаўства, удакладнены іх аб’ём і інструментарый. З улікам навейшых распрацовак беларускіх вучоных і вопыту замежнага літаратуразнаўства скарэкціраваны крытэрыі філасофска-антрапалагічнай канцэпцыі літаратурнага героя, а таксама аўтара і героя ў літаратурным творы. Ахарактарызавана жанравая сістэма і яе дынаміка, у тым ліку ўзнікненне новых жанраў, у беларускай прозе XX – XXI стст.; устаноўлена тыпалогія, аксіялагічныя дамінанты, канцэптуальнасць герояў, спецыфіка паэтыкі і стылістыкі твораў буйнейшых прадстаўнікоў нацыянальнай прозы. Атрыманыя вынікі рэкамендуюцца да далейшага ўкаранення ў адукацыйна-выхаваўчы працэс у агульнаадукацыйных школах, СНУ, ВНУ РБ.